IBO IB DIPLOMA PROGRAMME
PROGRAMME DU DIPLÔME DU BI
PROGRAMA DEL DIPLOMA DEL BI



**BELARUSSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Monday 10 May 2004 (afternoon)
Lundi 10 mai 2004 (après-midi)
Lunes 10 de mayo de 2004 (tarde)

1 hour 30 minutes / 1 heure 30 minutes / 1 hora 30 minutos

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Write a commentary on one passage only. It is not compulsory for you to respond directly to the guiding questions provided. However, you may use them if you wish.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- N'ouvrez pas cette épreuve avant d'y être autorisé(e).
- Rédigez un commentaire sur un seul des passages. Le commentaire ne doit pas nécessairement répondre aux questions d'orientation fournies. Vous pouvez toutefois les utiliser si vous le désirez.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Escriba un comentario sobre un solo fragmento. No es obligatorio responder directamente a las preguntas que se ofrecen a modo de guía. Sin embargo, puede usarlas si lo desea.

Напішыце каментарый да аднаго з дадзеных тэкстаў. Не абавязкова адказваць на пытанні, дадзеныя пасля кожнага з тэкстаў. Але іх можна ўжываць у адказе па жаданню.

1.(a)

Адно сказаць,
як пішацца - пішы,
не мудрагеліць,
слухацца натхнення...
Кляймёныя адзнакаю душы
тваімі стануць гэтыя імгненні.

Пішы -
і паслухмяная рука
накрэсліць знакі,
словы занатуе
і перадасць пульсацыяй радка
суіснасці пульсацыю крутую.

Магчыма, справядлівы меркаванні:
і тэму ўзяць ,
і рух адлюстраваць...
Ды кожны раз твае выратаванне
і клопат твой - як пішацца, пісаць.

У двух часах
з сумненнем і надзеяй,
у двух часах спыняюся, бягу...
Але заўжды
па-новаму не ўмею,
а па-старому ўмею -
не магу

Што застаецца нам ад летуценняў,
што самі пакідаем мы ў жыцці ?
Адно сказаць -
прыйшлі б у час здзяйсненні,
а іншае -
самім да іх прыйсці.

Самаахвярны клопат
блаславёны.
Не згіне свет з адмецінай душы...
Ёсць рацыя сказаць:

жыві натхнёна
і паўтарыць:
як пішацца - пішы.

Алесь Разанаў. Танец з вужакамі. 1999

- Як галоўныя думкі верша падаюцца паэтам ?
- Як структура верша ўзмацняе галоўную думку твора ?
- Разгледзце як ужыванне вобразных сродкаў дапамагае перадаць інтэнсіўнасць пачуццяў паэта.
- Якія вашы асабістыя адносіны да думак, выказаных у вершы ?

1(b) Помста

Усё пачалося з аднае раніцы, калі ў ноздры ўляцеў падазрона знаёмы пах. Такі пах рэдка, вельмі рэдка прыносіў паўднёвы вецер... Адтуль, з-за вялікіх рэк, з-за густых лясоў, з таго краю, улюбёнага навечна, і з якім навечна разлучаны двухногімі затхлякамі...

Потым азначылася - блізка і родна пахла ад двух мужчын і дзвюх жанчын. О! Які гэта быў салодкі пах - сапраўдны водар! Уканцэнтраванне ўсяго, што было мінулым, радасцю жыцця, яго трымценнем, матэрыяльным увасабленнем мілаты ўласнага колішняга існавання.

Кожны раз, як тыя людзі праходзілі міма, раздзімаў ноздры і піў пах радзімы: родных лясоў, палян, паляўнічых сцежак, а таксама пах сялянскіх хамутоў, каламазі, ранішні пах з варыўняў...

Спачатку проста радаваўся, атрымліваў насалоду ад знаёмых, мілых пахаў. Потым водар радзімы стаў выклікаць злосць, будзіў гнеў, а затым , з цягам часу, лютая нянавісць да гэтых людзей, якія прынеслі такі родны да няўсцерпу напамін пра радзіму, стала працінаць кожную часцінку цела. Ці ж не гэтыя людзі ўвязнілі яго, пазбавілі свабоды, закінулі далёка-далёка ад родных мясцін, прытарабанілі ў скрынцы сюды, дзе ў высокіх чырвоных берагах цячэ быццам і блізкая і ў той жа час чужая, незнаёмая халодная рака, ад якой вечарамі патыхае салодкай, падлаватай вільгаццю, дзе стаяць бронзавыя. аж да чырвонасці ў камлях, такія нягодныя сосны... Такія ненатуральныя, такія нямілыя.

Нянавісць патрабавала выхаду, помсты...Як адпомсціць? Ухапіць, угрызці руку, якая калісь гладзіла, а потым па-здрадніцку аддала на пакуты, калі затаўклі дрынамі ў скрынку з маленькай адтулінай, потым бясконца доўга везлі на чужыну, зрэдку кідаючы кавалак хлеба ці абгрызеную костку. Вады не давалі , ледзь не здох ад смагі... Потым укінулі сюды, за гэтыя гладкія жалезныя прэнты, дзе так мала месца, што, здаецца, не хапае паветра дыхаць. Ён ужо даўно не хацеў жыць, бо ягонае жыццё засталося там, на Палессі, сярод дубоў і грабаў, у зарасніках лазы, на балотных рэчках, у густых чаратах... Кропля за кропляй жыццё выдыхалася, выточвалася з яго...І, пэўна, вытачылася б зусім, каб не той пах, які зрэдку прыносіў паўдневы вецер, нібы падманваўся, нібы дзеля большай пакуты пацвярджаў, што той край ёсць, тыя мясціны, дзе быў шчаслівы і самазабыўчы, не саснёныя у хваравітых снах-мроях, але існуюць насамрэч, напрауду ёсць. І там ўзыходзіць штодня сонца, і там журботна шапочуць вершаліны дрэў, і там штораніцы ў лазе залівіста, пранізліва стракочуць сарокі... Не, не... Яму туды дарога заказана, усё праз гэтых во двух паноў у кацялках і паненак у доўгіх сукнях, якія во глядзяць на яго, як на дзіўную смярдзючую падлу, калі ад саміх мертвым мясам пахне...

І вось цяпер, калі наноў пацвердзілася, што край мілотны ўсё-ткі ёсць і,мала таго, з таго краю прыехалі, аказаліся тут гэтыя во людзі, насычаныя роднымі пахамі, якія прабіваліся праз іхнія ўласныя воні, пакута вярнулася, запульсавала надзеяй, трывогай: а мо яшчэ воля магчыма, а мо яшчэ можна ўцячы , вызваліцца ад жалезных кратаў, пабегчы з усіх чатырох лап туды, да роднага , мілага, сціхотнага. І разам з надзеяй, трывогай ажылі нянавісць, прага нялюдскай, звярынай помсты.

Пах роднага і дух людзей, якія здрадзілі, бунтавалі ў вауку кроў. Адпомсціць, укусіць, адгрызці рукі, ногі, галаву... Галоўнае - прыкінуцца добрым, падмануць,

увайсці ў давер. Няхай у вачах засвеціцца зычлівасць, няхай толькі зажадаюць дакрануцца да яго ( дурныя двухногія! - ім абавязкова захочацца дакрануцца да яго, пагладзіць. О! Як ён ім пагладзіць! ) Трэба і хвастом пакруціць, і галавой, каб паказаць, што ён іх пазнаў, што ён рады ім. Ага - адзін з іх падыходзіць бліжэй, рука аж свярбіць, аж пачырванела, каб пагладзіць яго, але яшчэ баіцца...-

Так, так... Стану ледзь не пасміхацца, падманліва радавацца, хвастом па баках шлёгаць, як сабака які... Ага, працягвае руку! Бліжэй жа, яшчэ бліжэй! Ну, вось і ўсё - блізка, ёсць! Імгненна міласць на гнеў перакінуць, пашчай, як кляшчамі, - цоп ненавісныя панскія растапыркі! І трымаць, і трымаць, і шкуматаць, грызці, сціскаць - нічога, няхай б'юць, хоць рэжуць, хоць заб' юць! А ён атрымае - о слодыч! - радасць сваім скіўцам !

Алесь Наварыч. Літоўскі воўк. 2003

- Якія сродкі ўжывае аўтар у гэтым тэксце, разглядаючы тэму вольнасці?

- Як структура гэтага тэксту ўзмацняе ўплыў галоўнай дзеючай асобы на чытача?

- Разгледзце ролю і характар вобразных сродкаў у гэтым тэксце.

- Якое ўражанне зрабіў на вас гэты тэкст?